# Да летняга сезону

Гэтымі днямі ў шырокаэкранным кінатэатры г. Салігорска была арганізавана выстаўка-продаж мужчынскага і жаночага адзення сезону 1964 года. Каля 600 чалавек запоўнілі прасторную залу. Тут былі шахцёры, будаўнікі, рабочыя саўгаса «Салігорскі», калгаснікі з навакольных вёсак. Дзве гадзіны манекеншчыкі рэспубліканскага Дома мадэлей дэманстравалі навейшыя фасоны мужчынскага і жаночага адзення. Затым наведвальнікі пайшлі на выстаўку - продаж. Там многія з іх купілі адзенне навейшых фасонаў. Было прададзена тавараў больш чым на 8 тысяч рублёў.

Добрую справу зрабілі работнікі Салігорскага гархарчпрамгандлю сумесна з Мінскай базай «Белгандальадзенне», арганізаваўшы выстаўку - продаж.

**В. ЦЕСАВЕЦ,**
**настаўнік Салігорскай школы рабочай моладзі.**